Аляксандр РАДЗЬКОЎ

# З кнігі «МОЙ ФІЗМАТ»

*(Працяг. Пачатак у нумарах за 22 і 23 верасня.)*

## Іван Іванавіч МАРТЫНАЎ

Мы былі яшчэ першакурснікамі, калі ў фае першага паверха ўбачылі незвычайную для нас, яркую аб'яву. Фізмат віншаваў свайго выпускніка Івана Іванавіча Мартынава з паспяховай абаронай кандыдацкай дысертацыі. Гэта навіна на мяне, напрыклад, падзейнічала пазітыўна, можна нават сказаць, натхніла. Да гэтага часу мы ўжо адчулі, што вучыцца на фізмаце вельмі цяжка, за непаспяховасць адлічваюць рэгулярна і не шкадуючы, задача-мінімум — выжыць, утрымацца ў інстытуце. А тут — выпускнік нашага факультэта паступіў у аспірантуру і адразу пасля яе заканчэння абараніўся, стаў кандыдатам фізіка-матэматычных навук у галіне тэорыі дыферэнцыяльных ураўненняў. Ён жа змог! Значыць, не трэба баяцца і здавацца — можна, пастараўшыся, і пэўных вышынь дасягнуць.

Іван іванавіч быў родам з невялікай вёскі Петухоўка Чавускага раёна. Нарадзіўся ў час вайны і зусім дзіцем патрапіў у канцлагер, выжыў, пасля добра вучыўся, паступіў на наш фізмат, і там яго прыкмецілі выкладчыкі. Парэкамендавалі ў аспірантуру да прафесара БДУ Ю. С. Багданава. Юрый Станіслававіч — вучань акадэміка М. П. Яругіна, заснавальніка і натхняльніка навуковай школы сусветнага ўзроўню, таксама адзін з самых аўтарытэтных матэматыкаў Беларусі. Ён лічыў Івана Іванавіча адным з найлепшых сваіх вучняў, пры гэтым шанаваў у ім перш-наперш чалавечыя якасці: чэснасць, адказнасць, прыстойнасць. Выхаваны цяжкай вясковай працай, пабачыўшы на сваё вочы зло, гвалт, вераломства і здрадніцтва, Мартынаў вызначаўся абвостраным пачуццём справядлівасці. Да студэнтаў, калег, увогуле да людзей адносіўся паважліва, нават клапатліва, але да тае пары, пакуль не сутыкаўся з непрыстойнасцю і зламыснасцю. Вось тады яго адносіны да такога чалавека станавіліся прынцыпова патрабавальныя, а часам і непрымірымыя.

Пакуль мы вучыліся на малодшых курсах, Іван Іванавіч быў у нас намеснікам дэкана. Ён шчыра любіў свой фізмат, імкнуўся, каб наш факультэт быў найлепшы ў інстытуце, вельмі шмат часу праводзіў са студэнтамі. Дапамагаў рыхтаваць камсамольскія і прафсаюзныя сходы, удзельнічаў з намі ў суботніках, прысутнічаў на ўсіх рэпетыцыях пры падрыхтоўцы да конкурсаў мастацкай самадзейнасці. Запомнілася, што пасля нашых выступленняў на сцэне ён купляў для нас велізарны куль цукерак.

Пры ўсёй знешняй строгасці Іван Іванавіч валодаў унікальным пачуццём гумару і быў арганізатарам многіх розыгрышаў сваіх сяброў. У той час калі ён абараніў дысертацыю, у інстытут для працы на фізмаце былі накіраваны яго равеснікі, таксама маладыя кандыдаты фізіка-матэматычных навук: К. К. Жылік, Я. В. Карабёнак, А. К. Лапкоўскі. Усе былі яшчэ халастыя, жылі ў студэнцкім інтэрнаце, сябравалі. Іван Іванавіч пасля расказваў, што яны там вытваралі.

У гэты ж час на геаграфічны факультэт прыехала выкладаць маладая, стройная, нязвыкла для нас прыгожая асецінка. Яна, безумоўна, не магла не прыцягнуць да сябе ўвагу гэтых халасцякоў. А. К. Лапкоўскі прыўдарыў за ёю з усім запалам, але... узаемнасці не дамогся. Мартынаў і кампанія назіралі з боку за гэтымі заляцаннямі і вырашылі Анатоля Кузьміча разыграць. Іван Іванавіч апрануўся так, як тая асецінка, прылёг на ложак, накрыўся з галавой, а яго сябры сказалі Лапкоўскаму, што дзяўчына вельмі засмучаная, не зразумела яго адносіны да сябе, перажывае, плача. Анатоль Кузьміч імгненна кінуўся яе супакойваць, гладзіў, гаварыў ласкавыя словы, прызнаваўся ў сваіх пачуццях. І раптам з галавы «дзяўчыны» спадае хустка і адкрываецца гарэзны твар Мартынава... Лапкоўскі доўга не мог дараваць Івану Іванавічу гэтую дурноту, але з часам яна ўвайшла ў бяскрыўдны фальклор інстытута.

Мартынаў быў нейкім зямным, рэальным, блізкім да нас, студэнтаў, чалавекам. Строгім, але зразумелым, у нечым і арыгінальным. <...>

Лекцыі да нас Мартынаў прыйшоў чытаць на трэцім курсе. Гэта была тэорыя функцый сапраўдных пераменных. Матэматыку ён, безумоўна, адчуваў і ведаў. Але канспект за ім пісаць было няпроста — вельмі імпульсіўны, імклівы, часам у яго думкі апярэджвалі словы. Таму да экзамену мы рыхтаваліся па падручніках. Характэрна, што як вучоны-матэматык ён патрабаваў паказаць веды, разуменне выкладзенай тэорыі, а не адказу выключна па яго канспекце. Іван Іванавіч бачыў здольнасці студэнтаў, іх адносіны да вучобы, адкрыта паважаў і падтрымліваў тых, хто праяўляў старание. У нас на экзамене быў пацешны выпадак. Мой аднакурснік Валерый Іваноў забыўся доказ незлічонасці мноства сапраўдных лікаў і стаў паціху прасіць мяне дапамагчы яму ў гэтым. Мартынаў і яго, і мяне ведаў як добрых студэнтаў, але ніяк не мог зразумець, хто каму падказвае. Так і не разабраўся, але ўсё ператварыў у жарт, як след пры адказе апытаўшы абодвух, і кожнаму з нас паставіў «выдатна».

З Іванам Іванавічам мы з часам пасябравалі. Пры гэтым неяк натуральна, як быццам так і павінна быць. Пры ім я пачынаў працаваць асістэнтам, шукаў сябе ў навуцы, абараняўся, паступова падымаўся па службовай лесвіцы. Збліжала нас і тое, што яго жонка Зінаіда была маёй зямлячкай, яна родам з Быхава, і мы з ёю часта прыгадвалі родныя абодвум нам мясціны. Яна, дарэчы, таксама скончыла наш фізмат і нават некаторы час працавала на факультэце.

Я вельмі ўдзячны Івану Іванавічу за тое, што ён пазнаёміў мяне з гісторыкам Якавам Іванавічам Трашчанком. Ён тады быў суседам Мартынавых, і мы часам збіраліся разам у Івана Іванавіча пасядзець, пагаварыць, выпіць. Мартынаў і Трашчанок былі ў нечым падобныя — абодва разумныя, дзёрзкія, бескампрамісныя, начытаныя, са сваімі поглядамі на жыццё. Стасункі з імі — гэта сапраўдная школа развіцця, прафесіяналізму. Якаў Іванавіч да канца свайго жыцця заставаўся нашым настаўнікам. І не толькі нашым. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка быў адным з любімых вучняў Трашчанка. Мне — ужо як міністру адукацыі — даводзілася неаднаразова па даручэнні Прэзідэнта наведваць Якава Іванавіча, каб выветліць яго меркаванне па тым ці іншым гісторыка-палітычным пытанні. Для Прэзідэнта гэта было важна, ён таксама лічыў Якава іванавіча сваім настаўнікам і давяраў яму.

З часам Іван іванавіч заняў пасаду прарэктара па рабоце са студэнтамі-завочнікамі, захапіўся даследаваннямі ў галіне педагогікі. Яго чамусьці заўсёды цікавілі метады выхавання хлапчукоў. Рабіў усё Мартынаў энергічна, шырока, можна сказаць, азартна. Лідар па натуры, ён часам мог пераўзысці суразмоўцу, калегу, але пры гэтым захапіцца, адхіліцца ад тэмы, а то і зусім не патрапіць у яе. Ужо ў час свайго рэктарства гляджу вечарам праграму абласнога тэлебачання. Абмяркоўваюцца псіхалагічныя праблемы сямейных адносін. Два ўдзельнікі — загадчык кафедры псіхалогіі дацэнт Э. Катлярова і прарэктар універсітэта, дацэнт І. Мартынаў. Мартынаў, па характары непаседа, палеміст, часта перабівае Катлярову, хоць і відавочна саступае ёй у разуменні абмяркоўваемага пытання. Тая ледзьве паспявае выводзіць тэму ў патрэбнае рэчышча.

Клічу назаўтра раніцай да сябе Івана Іванавіча і кажу яму, што ён — прарэктар, прадстаўляе кіраўніцтва ўніверсітэта, таму не павінен саступаць загадчыцы кафедры. Адпаведна, ці трэба грунтоўна рыхтавацца, тым больш па пытанні, дзе ты не прафесіянал, ці сысці з праграмы. Іван Іванавіч сышоў з праграмы, але падобныя размовы ніяк не ўплывалі на нашы службовыя і сяброўскія адносіны. Мартынаў на мае пралікі і недапрацоўкі ўказваў карэктна, але без сарамлівасці.

Ёсць яшчэ гісторыя, якая, я ўпэўнены, не закончылася да гэтага часу. І яна таксама звязана з характарам Мартынава, яго ўпартасцю пры дасягненні мэты, якую ён перад сабой паставіў.

Сустракаю ва ўніверсітэце міністра адукацыі В. І. Стражава. Ён прыбыў з дзелавым візітам, але выходзіць з машыны ўзбуджаны, абураны, адразу заяўляе:

— Радзькоў, еду да цябе ва ўніверсітэт, па дарозе ўключаю радыё і чую, як твой прарэктар Мартынаў накінуўся на мяне з крытыкай, што я не даю ход яго манаграфіі і тым самым перашкаджаю ўкараненню правераных, актуальных, на дзіва неабходных грамадству метадаў выхавання юнакоў. Ты разбярыся, што ў цябе за прарэктар!

Гісторыя для мяне не новая. іван іванавіч сапраўды напісаў кнігу пра тое, як трэба выхоўваць хлопчыкаў. Пісаў кнігу грунтоўна, карыстаўся архівамі, сучаснымі даследаваннямі ў галіне педагогікі і псіхалогіі, «даставаў» кожнага з нас, спрабуючы ўцягнуць у гэту праблематыку. Але, самае галоўнае, папку з рукапісам сваёй кнігі на дадзеную тэму ён дэманстратыўна, пры людзях, часцей за ўсё на вялікіх сходах уручаў новаму назначэнцу на пасаду міністра адукацыі. Яе атрымалі Л. У. Сухнат, М. І. Дзямчук, В. А. Гайсёнак, прыйшоў час і В. І. Стражава. Вось той і ўскіпеў. У мяне не заставалася выхаду, як самому прачытаць рукапіс, разабрацца з гэтай працай Мартынава. Прашу прынесці мне яго папку. Прачытаў на адным дыханні. Жыва, пераканаўча, проста, цікава. Кажу Івану Іванавічу:

— Методыку выхавання хлопчыка ў сям'і і ў грамадстве вы выбудоўваеце ў асноўным на прыкладзе жыцця Івана Грознага. Але ж гэта выхаванне перш за ўсё цара. Наўрад ці гэта падыходзіць для любога хлопца.

Не думаю, што я пераканаў Мартынава. Болей таго, упэўнены, што ён працягвае атакаваць сваімі ідэямі чарговых міністраў.

Было яшчэ адно цікавае захапленне Івана Іванавіча: ён заняўся вывучэннем магчымасцяў чалавечага мозга. Атрыманыя ў час даследаванняў рэзультаты і высновы ён дэманстраваў нам на сабе, заклікаючы актыўна іх выкарыстоўваць у паўсядзённай практыцы. У прыватнасці, ён быў глыбока ўпэўнены ў карысці вуснага лічэння для развіцця памяці і ўвогуле мыслення. Ведаў мноства арыгінальных, вельмі эфектыўных прыёмаў такога ліку, настойліва заклікаў настаўнікаў матэматыкі выкарыстоўваць іх на ўроках. Перад намі ж выступаў з дэманстрацыяй зусім фенаменальных здольнасцяў мозга, якія ён змог развіць дзякуючы ўпартым і сістэматычным заняткам. Сядзім на яго папулярнай лекцыі. Ён паказвае нам магчымасці сваёй памяці. Просіць дзесяць прысутных калег назваць па адным пяцізначным ліку. Яго асістэнт запісвае гэту лічбавую паслядоўнасць на дошцы. Іван Іванавіч паварочваецца да гэтага запісу, хвіліны тры яго вывучае і пасля без ніводнай памылкі прагаворвае!

Яшчэ адна тэма аб'ядноўвала мяне з Іванам Іванавічам. Мы рэгулярна чыталі часопісы «Наука и жизнь», «Знание — сила», «Природа». Калі яны ў чытальнай зале былі на руках, то, як правіла, у яго ці ў мяне. І Мартынаў быў заўсёды «набіты» цікавымі звесткамі, фактамі з сучасных даследаванняў.

Мне зараз не хапае каларыту гэтай асобы.

**Пераклаў з рускай мовы Максім ВЕЯНІС.**

*(Працяг будзе).*